# Легіён Марыі. Тэсэра

## *Уступныя малітвы*

У Імя Айца і Сына і Духа Святога. Амэн.
Прыйдзі, Дух Святы, напоўні сэрцы верных Табе і запалі ў іх полымя Тваёй любові.
**V.** Спашлі Дух Твой, і ўсё будзе створана.
**R.** І Ты абновіш аблічча зямлі.

**Молімся.**
Божа, Ойча наш, напоўні свет дарамі Святога Духа. Ты паслаў Духа нашаму Касцёлу, каб пачаць навучаць Бібліі: цяпер няхай Дух Святы працягвае тварыць у свеце праз сэрцы тых, хто верыць. У імя Пана нашага Езуса Хрыста.
**R.** Амэн.

**V.** Пане, адкрый вусны мае
**R.** І вусны мае апавясцяць хвалу Тваю.
**V.** Божа, прыйдзі мне на дапамогу.
**R.** Пане, паспяшы да мяне на паратунак.
**V.** Хвала Айцу і Сыну, і Духу Святому.
**R.** Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амэн.

*Далей ідуць пяць дзясяткаў малітваў Ружанца з малітваю "Вітай, Каралева".*

Вітай, Каралева, Маці міласэрнасці, жыццё, асалода і надзея нашая, вітай! Да Цябе звяртаемся мы, выгнанцы, дзеці Евы. Да Цябе ўздыхаем, стогнучы і плачучы ў гэтай слёз даліне. Дык звярніж на нас, Заступніца нашая, Твае міласэрныя вочы. І Езуса, благаславёны плод улоння Твайго, з'яві нам пасля выгнання гэтага. О ласкавая, о літасцівая, о наймілейшая Панна Марыя.
**V.** Маліся за нас, Святая Багародзіца.
**R.** Каб сталіся мы годнымі абяцанняў Хрыстовых.

*Молімся.*
О Божа, Твой Адзінародны Сын сваім жыццём, смерцю і змёртвыхпаўстаннем адарыў нас скарбам вечнага шчасця; дай нам, молім Цябе, каб, разважаючы гэтыя таямніцы Яго жыцця ў Найсвяцейшым Ружанцы, мы маглі наследаваць тое, што ў іх змешчана, і атрымаць тое, што ў іх абяцана. Праз Хрыста, Пана нашага. Амэн.
**V.** Найсвяцейшае Сэрца Езуса, **R.** Змілуйся над намі
**V.** Беззаганнае Сэрца Марыі, **R.** Маліся за нас
**V.** Святы Юзаф, **R.** Маліся за нас
**V.** Святы Ян Евангеліст, **R.** Маліся за нас
**V.** Святы Людовік дэ Манфор, **R.** Маліся за нас
**V.** У імя Айца і Сына і Духа Святога. **R.** Амэн.

## *Катэна Легіёну*

*Антыфона.* Хто Яна, што набліжаецца, як ранішняя зара, цудоўная, як месяц, ясная, як сонца, грозная, як войскі перад бітваю ?

Велічае душа мая Пана;
і ўзрадаваўся дух мой у Богу, Збавіцелі маім,
што глянуў Ён на пакорнасць рабы сваё,
бо адгэтуль шчасліваю называць будуць мяне ўсе роды;

Бо вялікае ўчыніў мне Дужы;
і святое імя Яго;
і міласць Яго ў роды радоў
для тых, што баяцца Яго.

Учыніў сілу рукой сваёй;
рассеяў гордых думкамі сэрца іх;
адабраў у моцных пасады,
узвялічыў пакорных,

галодных здаволіў дабром,
а багатыроў адпусціў ні з чым.

Прыняў Ізраіля, слугу свайго,
успомніў міласць,
Як гаварыў да айцоў нашых,
да Аўраама і насення яго давеку.

Хвала Айцу і Сыну, і Духу Святому. Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды і на вякі вечныя. Амэн.

*Антыфона.* Хто Яна, што набліжаецца як ранішняя зара, цудоўная, як месяц, ясная, як сонца, грозная, як войскі перад бітваю?
**V.** О Марыя, без граху пачатая.
**R.** Маліся за нас, хто ў Цябе паратунку шукае.

**Молімся**
Пане наш Езу Хрыстэ, Заступнік наш перад Айцом, які Найсвяцейшую Панну, Маці Сваю, учыніў нашаю Маці і нашаю Заступніцаю перад Табою, зрабі па міласэрнасці Сваёй, каб кожны, хто да Цябе звяртаецца, атрымаў усе Твае ласкі праз Яе. Амэн.

## *Малітва на заканчэнне*

У імя Айца і Сына, і Духа Святога. Амэн.

Тваёй абароне аддаемся, Святая Багародзіца, у нашых патрэбах не пагарджай маленнем нашым. І ад усялякай злой прыгоды выбаўляй нас заўсёды, Панна хвалебная і благаслаўлёная.

**V.** Беззаганная Панна Марыя, Пасрэдніца ўсіх ласкаў
*/Ідзе асобы малітоўны зварот Прэзідыума/* **R.** Маліся за нас
**V.** Святыя Арханёлы Міхаіл і Габрыэль **R.** Маліцеся за нас
**V.** Усе Сілы Нябесныя, анёльскі Легіён Марыі **R.** Маліцеся за нас
**V.** Святы Ян Хрысціцель **R.** Маліся за нас
**V.** Святыя Петр і Павел **R.** Маліцеся за нас.

Адары, Пане, нас, хто служыць пад харугвамі Найсвяцейшай Панны Марыі, тою паўнатою веры ў Цябе і тым спадзяваннем на Яе, якім належыць заваяваць свет. Адары нас вераю жывою, натхнёнаю ласкаю, якая дазволіць нам рабіць усе нашыя справы з чыстай любові да Цябе, і заўсёды бачыць Цябе перад сабою і служыць Табе праз службу бліжняму; веру цвёрдую і непахісную, як скала, праз якую мы застанемся спакойнымі і цвёрдымі ў смутку, пакутах і жыццёвых расчараваннях; дай нам веру мужную, якая будзе натхняць нас на пераадольванне і здзяйсненне без вагання вялікіх спраў дзеля Хвалы Божае і дзеля ўратавання душ; веру, якая павінна стаць стаўпом агнявым нашага Легіёну, каб весці нас, аб'яднаных у нашым руху, наперад, каб запаліць усюды агонь Божай любові, каб асвяціць святлом ісціны тых, хто

знаходзіцца ў цемры смяротнай, каб запаліць раўнадушных, каб вярнуць да жыцця тых, хто мёртвы ў граху; дай нам веру, якая накіруе нашыя крокі па шляху міру, каб пасля барацьбы ў гэтым жыцці, не згубіўшы ні аднаго са сваіх членаў, Легіён наш змог сабрацца ў Валадарстве любові і хвалы Тваёй. Амэн.

Няхай душы нашых памерлых легіянераў і душы ўсіх памёрлых верных спачываюць у супакоі праз міласэрнасць Божую. Амэн.

У імя Айца і Сына і Духа Святога. Амэн.